# НАВУКОВЫЯ ПОГЛЯДЫ М. І. ЕРМАЛОВІЧА НА ЎТВАРЭННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

***Р. Н. Мозаль***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

М. І. Ермаловіч у сваіх навуковых працах даказвае, што:

1. Ніводная гістарычная крыніца не пацвярджае літоўскага заваявання Чорнай Русі і іншых беларускіх зямель, што нібыта і паклала пачатак утварэнню Вялікага княства Літоўскага. Такое сцвярджэнне ўзнікла ў сярэдзіне XVI ст., каб ідэалагічна абгрунтаваць права Вялікага княства Літоўскага на беларускія землі, значная частка якіх тады часова была занята войскамі цара Івана Жахлівага.

Жывучасць версіі пра літоўскае заваяванне Беларусі тлумачыцца тым, што яна была выкарыстана расійскай дакастрычніцкай гістарыяграфіяй з мэтай пацвярджэння тэзіса пра выратавальнае значэнне Расійскага самадзяржаўя.

2. Значнай перашкодай для аб’ектыўнага асвятлення працэсу ўтварэння Вялікага княства Літоўскага з’яўляецца атаясамліванне летапіснай Літвы (XI–XIII ст.) з усходняй часткай сучаснай Літвы (тагачаснай Аўкштайцыяй). Тое, што ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага суправаджалася заваяваннем балцка-літоўскіх зямель (Літвы, Налышчанаў, Дзяволтвы), знішчэннем і выгнаннем іх феада лаў, адхіляе пашыранае ў навуцы сцвярджэнне, што ўзнікненне гэтай дзяржавы дыктавалася інтарэсамі феадалаў Аўкштайцыі.

Першакрыніцы аб падзеях XII–XIII ст. сведчаць, што старажытная Літва знаходзілася на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Так, у летапісных крыніцах існуе шмат доказаў наконт суседства Літвы з Тураўшчынай.

3. Дзяржаўнасць ВКЛ не разглядалася як палітычнае ўтварэнне, сукупнасць палітычных інстытутаў, а зводзілася да тэрыторыі, мовы, этнічных прыкмет.

4. М. І. Ермаловіч падкрэслівае, што вучоныя, якія даказвалі супрацьлеглае, не ўлічвалі таго, што: а) да стварэння ВКЛ на беларускіх землях знаходзіліся моцныя гістарычныя вобласці, у якіх ужо існаваў феадалізм і дзяржаўная ўлада; б) літоўцы мелі менш дасканалую ваенную арганізацыю, чым новагародцы; в) Міндоўг з’явіўся ў Навагрудку як перабежчык, а не як заваёўнік.

5. Такім чынам, не ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага было перадумовай фарміравання беларускай народнасці і культуры, а, наадварот, працэс фарміравання ВКЛ, які праходзіў на грунце эканамічнага і культурнага збліжэння беларускіх земляў і зараджэння новай дзяржаўнасці ў Навагрудку, быў перадумовай утварэння ВКЛ.

Патрэбна адзначыць, што кнігі М. І. Ермаловіча, выдадзеныя больш за тры дзесяцігоддзі назад, усё яшчэ цікавяць чытачоў і

ўзбуджаюць навуковыя спрэчкі. Відаць, жывуць яшчэ міфы, па слядах якіх М. І. Ермаловіч ішоў шмат гадоў, таму што ранейшы манумен тальны марксісцка-ленінскі гмах афіцыйнай гісторыі, пабудаваны на пяску і балоце, правінцыйны літаратар (не гісторык) разваліў сотняю падпольных машынапісных старонак. Зараз яго называюць заснаваль нікам новай беларускай рамантычнай гістарыяграфіі. Акадэмічная навука мае да ягоных прац шмат заўваг, але ніхто з крытыкаў не можа адмовіць, што М. І. Ермаловіч у свой час здзейсніў сапраўдны навуковы подзвіг: адкінуўшы канцэпцыю несамастойнасці гісторыі Беларусі, абудзіў цікавасць да мінулага ў дзесяткаў тысяч суай чыннікаў, якія спрычыніліся да навуковых дыскусій і пачалі распра цоўваць уласную гісторыю. Аб гэтым сведчаць шматлікія публікацыі, аўтары якіх усё часцей спасылаюцца на працы М. І. Ермаловіча.

Нетрадыцыйныя погляды на гісторыю, самастойнасць мыслення аўтара, крытычнае стаўленне да прадстаўнікоў дарэвалюцыйнай і савецкай гістарычнай навукі, арыгінальныя высновы, падмацаваныя цэлай сістэмай доказаў і параўнаннем фактаў з розных летапісаў і замежных хронік, дазволілі Міколу Іванавічу Ермаловічу прапанаваць уласную канцэпцыю мінуўшчыны Беларусі.